# Спіс літаратуры
# “Чытаем па-беларуску! Далучайся і ты!”




## Андрэйкава казка. Або прыпавесць пра намаляваны і жывы свет /

Маеўская Ніна; - Мінск: Юнацтва, 1999. - 79с.

*Прыпавесць найперш адрасавана дзецям дашкольнага ўзросту, Нават дзеянне найбольш адбываецца ў дзіцячым садзіку. Надзённыя дзіцячыя справы і думкі іх равеснікаў не могуць не захапіць маленькіх чытачоў.*

---

## Цуды ў хаціне. Апавяданні /

Брыль Янка;- Мінск, 1998. – Юнацтва.-111с.

*Творы народнага пісьменніка Беларусі, выдатнага майстра роднага слова Янкі Брыля, якія ўключаны ў гэты зборнік, выдаваліся раней.*
*Яны знайшлі ў чытачоў шырокі водгук своеасаблівай аўтарскай адметнасцю, душэунай дабрынёй і мудрасцю.*






**Казкі астранаўта. Касмічныя падарожжы беларусаў**/Баравікова Раіса. - Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009.- 176с.

*Чарговая кніга казак, напісаных ад імя астранаўта-беларуса. Дзівосны, заманлівы і таемны свет далёкіх планет адкрыецца чытачу і, безумоўна, захопіць не толькі неверагоднымі прыгодамі герояў кнігі, але і цікавымі звесткамі пра асобныя зоркі і нават цэлыя сузор'і. Пісьменніца ўдала спалучае поўны нечаканасцей свет чужых планет з блізкім і родным светам нашай планеты, дзе, зразумела, самыя прыгожыя і добрыя пачуцці звернуты да Беларусі.*

---

**Казачныя аповесці пра міжпланетнага Пажарніка і іншых мамурыкаў**/Баравікова Раіса.- Мінск: Юнацтва, 1996. - 95с.

*Мамурык — з далёкай планеты Мамурыі, каго адна знаёмая дзяўчынка пісьменніцы Раісы Баравіковай, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь назвала міжпланетным Пажарнікам, даўно спадабаўся юным чытачам. Новая кніга атрымала назву «Казачныя аповесці пра міжпланетнага Пажарніка і іншых мамурыкаў». Але падзеі, апісаныя ў гэтай кнізе, разгортваюцца не толькі на Мамурыі. Мамуры і мамурыкі вельмі ўпадабалі нашу зямлю, і ў казачных аповесцях дапытлівы чытач знойдзе шмат прыгодаў гэтых займальных і проста сімпатычных істот у мясцінах, добра знаёмых нам. Кніга будзе садзейнічаць экалагічнаму выхаванню дзяцей.*




**Казкі-чамучкі** / Г.І.Скаржынская-Савіцкая.- Мінск: Беларус. Энцыкл. Імя П.Броўкі, 2013.-32 с.:іл.

*Кніга "Казкі-чамучкі" з'яўляецца скарбонкай пазнавальных казак для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Пад вокладкай маленькі чытач знойдзе разгорнутыя і цікавыя адказы на пытанні "Чаму Васілёк жыве ў жыце?", "Чаму матылёк стаў Крапіўнікам?", "Чаму Сланечнік падобны на Сонца?", "Чаму Зязюля жыве ў ходзіках?" і інш.*